УДК 882.6-09

Т. М. Федарцова, дацэнт

# ВОБРАЗЫ ФАУНЫ Ў ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ

The article dwells upon images of Belarusian fauna as one of jenre and stylistic features of J. Kupala's poetic heritage. The character of this or that fauna image shows peculiar features of Belarusian mentality. Some aspects of this artistic aproach are vividly seen in the creative activity of Ya. Kupala. In the process of solving the question about the national idea images of the Belarusian fauna are prevailing and deal with the fate of Belarusian people, their national self-determination because each nation has their own traditions, their history of development, their mythology, their olympia of pagan gods and their own worship of living beings.

The analysis of Ya. Kupala's creative work in the context of a continual European literary process reveals the eternal vital problems of the essence of human beings' life in the mysterious and unique light of national and irrational existence.

**Уводзіны.** Так сталася ў беларускай культуры, што вялікія народныя песняры Я. Купала і Я. Колас увайшлі ў гісторыю сусветнай літаратуры галоўнымі напрамкамі сваёй творчасці як нацыянальныя сімвалы беларушчыны, як найлепшыя прадстаўнікі свайго народа і выбітныя знаўцы народнага жыцця, з якога яны чэрпалі вытокі свайго неўмiручага таленту.

Аналіз творчасці Янкі Купалы ў кантэксце несупыннага агульнаеўрапейскага мастацкага працэсу ярка высвечвае спрадвечна актуальныя праблемы існасці чалавечага існавання ў загадкавым і непаўторным паэтавым свеце рацыянальнага і ірацыянальнага быцця. Адным з феноменаў творчай лабараторыі нашага класіка з'яўляецца ўвядзенне вобразаў фауны, якія досыць выразна акцэнтаваны на тэматычна-сюжэтным, вобразна-выяўленчым, сэнсава-сімвалічным і агульнаэстэтычным узроўнях.

**Асноўная частка.** Вызначэнне характару функцыянавання тых ці іншых вобразаў фауны паказвае на падкрэслена карэктны напамінак пра існаванне і асаблівасці беларускага (а не любога іншага) менталітэту. Пэўныя аспекты такога творчага падыходу да вырашэння нацыянальнай ідэі метадалагічна важныя, дамінантныя і цалкам датычацца лёсу беларуса, яго нацыянальнага самавызначэння. Бо толькі пэўны народ мае сваю гісторыю, сваю міфалогію, свой сонм язычніцкіх багоў і свой татэм жывых істот.

Свет прыроды беларуса немагчыма ўявіць без вобразаў птушак, звяроў і жывёл. Нашым паэтам беларускі пейзаж бачыцца з буслямі на лугах і балотах, з конямі ў расе, зубрамі і ласямі ў пушчах. Наогул, у беларускай паэзіі чуецца вялікае сугучча птушыных галасоў, і ў наш час, калі ў Чырвонную кнігу занесены сотні відаў птушак і жывёл, яе можна назваць своеасаблівым даволі каштоўным духоўна-экалагічным запаведнікам. Таму і не дзіўна, што сярод шматлікіх арніталагічных вобразаў беларускай фауны, адлюстраваных у паэзіі, найбольш вылучаюцца вобразы птушак. Іх пералік ужо толькі ў адным вершы Алеся Гурло «Нашы птушкі» не можа не захапіць сваей энцыклапедычнасцю, бо ўтрымлівае 44 найменні. Ці ж гэта не Купалава традыцыя? Бо наш геніяльны творца ўжо ў першых сваіх вершаваных вопытах актыўна звяртаўся да арнітала-гічных вобразаў. Напрыклад, 12 сакавіка 1906 г. ён напісаў верш-прытчу «Каршун». Гэты твор, па сутнасці, яшчэ далёка не адышоў ад традыцыі вуснай народнай творчасці, бо мае траісты паўтор дзеяння, персаніфікаваныя вобразы, ды і манеру гучання паэт надаў яму больш эпічную, чым паэтычную. На карысць гэтага сцвярджэння сведчыць і павучальны тон апошніх радкоў: каршун (носьбіт зла) жорстка пакараны за крыважэрнасць, бо ён паляваў на бездапаможную хатнюю птушку не толькі з той мэтай, каб наталіць свой голад, а больш хацеў нацешыць паляўнічы азарт, таму адной ахвяры яму паказалася мала. Вядомы балгарскі фалькларыст, паэт і перакладчык Н. Вылчаў, які, дарэчы, пераклаў гэты верш на балгарскую мову, адзначыў паэтычную вартасць дадзенага твора і ўключыў яго ў хрэстаматыю па сусветнай літаратуры як узор класічнага гукавога і вобразнага ўвасаблення. Сапраўды, рытм у паэтычным свеце Купалы займае выключнае месца, адыгрывае надзвычай важную ролю. Бо прасякае сабой усе структуры верша і не толькі фармалізаваныя (кананічныя), але і сэнсатворныя, напаўняючы пры гэтым паэтычныя вобразы пэўным дынамізмам і непаўторнасцю.

Да вобраза каршуна даволі часта звяртаўся і Якуб Колас. Так, герой верша «З турмы» рады нават крыку «каршуна ў высі ненагляднай» – драпежнай птушцы, ды над сваім полем ці падвор'ем, ды на вольнай волі, а не тут, у зацятай адзіноце турэмных сцен.

Чатыры Купалавы вершы прысвечаны яшчэ адной крыважэрнай птушцы – гургану. Але ў кожным з іх роля птушкі мяняецца, калі ў першым, датаваным 1908–1909 гг., гурган вястуе дзяўчыне пра крывавую бойку і пагібель яе каханага, у другім аднайменным вершы гурган пастаянна суправаджае селяніна ў час палявых работ «і наклікае бяду» (1919), то ў байцы «Гурган і салавей» (1914) творца паказвае

хітрасць і няшчырасць крыважэрца і кемлівасць высакароднага салаўя, які адхіляе прапанову гургана на сваяцтва. А вось верш «Гурганы», таксама датаваны 1914 г., наогул выбіваецца з алегарычнага кантэксту, бо пад вобразамі ўсходняга і заходняга гургана паэт выводзіць непамерныя апетыты на беларускія землі царскай Масквы і панскай Варшавы. Гэты твор ужо выразна палітычнага гучання, востры і бескампрамісны, з лейтматывам нацыянальнага самавызначэння беларусаў.

Але любімай птушкай песняра з'яўляецца зязюля, спрадвечная варажбітка, вяшчунка долі, прадвесніца шчаслівых і нешчаслівых падзей у жыцці кожнага чалавека. Такая асноўная паэтычная інтэрпрэтацыя гэтага звыклага, але выбітнага вобраза, які сваімі вытокамі карэніцца ў фальклоры. У вершы «А зязюлька кукавала...», напісаным у Акопах у 1921 г., створаны яркі вобраз птушкі-прадказальніцы, які паўстае як спадарожніца чалавечага лёсу. Тут зязюля сваім куваннем сцвярджае хуткаплынны кругабег чалавечага жыцця:

Як на свет радзіўся Янка,
Як заплакаў многа-мала, –
Пела маці над калыскай,
А зязюлька кукавала…[1; с. 103].

У маладыя гады галоўнаму герою верша Янку – аратаму, сейбіту, музыку і проста шчыраму, працавітаму чалавеку – зязюлька зычыла долю, у сталыя – долю ягоным дзецям і ўнукам, і вось спрадвечна куку е яна над ягонай магілай… Цікава, што Аляксандр Твардоўскі на II з'ездзе пісьменнікаў Беларусі ў 1949 г. цытуючы дадзены верш, адзначыў, што Купала сапраўды з поўнай праматой мог сам пра сябе пры жыцці скласці песню, як на свет радзіўся Янка. Гэта праўда вялікага сапраўднага паэта зрабіла твор знакамітым. Словы «Як на свет радзіўся Янка…» актыўна выкарыстоўвалі ў сваёй творчасці М. Браўн і А. Бачыла, а Сымон Баранавых да верша «А зязюлька кукавала...» нават падабраў народную музыку.

Наогул верш стаў знакавым у Беларускай культуры. У 1972 г. выйшаў паўнаметражны дакументальны фільм «А зязюлька кукавала...» рэжысёра В. Дашука, у якім расказваецца пра лёс Я. Купалы. Мастак П. Сергіевіч на тэму верша «А зязюлька кукавала...» стварыў трыпціх: «Калыханка», «Ясевы універсітэты», «Сейбіт». Беларускія кампазітары А. Туранкоў, А. Валынчык, Б. Кавалеўскі, П. Падкавыраў, У. Тэраўскі, М. Чуркін і іншыя клалі твор на музыку. Твор перакладзены на 12 моў свету, у тым ліку на англійскую, французскую, нямецкую, чэшскую, балгарскую.

Традыцыйны вобраз любімай птушкі, але ўжо як прадказальніцы новага, светлага ладу жыцця, Купала з любоўю выводзіць у вершы «Алеся», датаваным 1935 г.:

Кукавала зязюля
У зялёным лесе,
Не згадала матуля,
Што выйдзе з Алесі.

Як набралася моцы
Матчына дачушка,
Паляцела да сонца
Пералётнай птушкай [2, с. 65].

Зноў жа твор у сваёй экспазіцыі мае тры паўторы, як і народны верш, але два з іх нясуць жыццесцвярджальную праўду пра ўсталяванне нязнаных раней ідэалаў жаночай долі ў новым грамадстве. Смелая дзяўчына-лётчык сама ўжо ўпадабляецца «пералётнай птушцы», якая «самалётавым крыллем / Воблакі калыша».

І гэтым Купалавым вершам зацікавілася сусветная літаратура, бо ён перакладзены на 22 мовы свету. А арніталагічны вобраз зязюлі ўпадобілі іншыя мастакі слова.

Голас зязюлі хваляваў душу і сэрца хворага Максіма Багдановіча, які звяртаецца да птушкі з просьбай: «Не кувай ты, шэрая зязюля, / Сумным гукам у бары; / Мо і скажаш, што я жыці буду, / Але лепш не гаворы» [3, с. 82]. З часоў «Слова аб палку Ігаравым» гэтая птушка з'яўляецца алегорыяй вобраза жанчыны-пакутніцы. Такі погляд зрэдку выяўляецца і ў сучаснай паэзіі. Сустракаецца і матыў шкадавання зязюлі як гаротніцы, птушкі няшчаснай долі: «Каго ж яна так гукала / Пасля зімовай разлукі? / За што ёй такая кара? / За што ёй такія мукі?» [4, с. 308], – задае рытарычнае пытанне Анатоль Грачаннікаў.

Анатоль Сербантовіч у зборніку «Жаваранак у зеніце» таксама шмат увагі надае арніталагічным вобразам, сярод якіх значнае месца адводзіць зязюлі, бо сцвярджае, што «Яна – матуля з вечным горам», вартая спачування. Але зязюля вяшчуе не толькі трывожнае, яна – птушка вясны, кахання, шчасця: «Лягчэй вясну без хлеба пражыць, / Чым без зязюлі» – адзначаў Рыгор Семашкевіч. Аднак найчасцей зязюля сваім куваннем нагадвае пра хуткі бег жыцця. Таму паэты просяць яе не лічыць гады.

Куванне зязюлі як прадвесце чарнобыльскай бяды, гора, смерці паказана ў паэме Сяргея Законнікава «Зязюля» (1996).

Пасля Чарнобыля сэнсавая трактоўка вобраза зязюлі стала драматычнай. Гэтая птушка зрабілася маўклівай, з атручаным голасам, скупой на сваё куванне (вершы А. Лойкі «Скупая зязюля», З. Дудзюк «Не прыляціць у мой куток зязюля...» і інш.).

У паэтычнай творчасці Янкі Купалы часта ўжываецца найменне такіх птушак, як сокал. («Вецер, і сокал, і я»), арол («Арліныя крыллі», «Арлянятам»), голуба і галубкі (легенда «Паляўнічы і пара галубкоў», «Голуб і дзяцюк»), кані і іншых птушак. Нарвежскі даследчык Марцін Наг зазначаў, што паэтычная і фаль-

клорна-сімвалічная дамінанты арніталагічных вобразаў у беларускага песняра тоесныя ўспрыманню іх нарвежскай літаратурай, бо звязаны з народнай традыцыяй і з настроем трывогі, пошуку, радасці і расчаравання паэта. Пэўную канкрэтызацыю іх дае час напісання твора. І гэта слушна. Напрыклад, у паэтычным зборніку «Ад сэрца», выдадзеным у 1940 годзе, безліч разоў паўтараецца эпітэт арліны: «арліная сям'я», «арліныя крылы», «арліны палёт», «арліныя вочы» «арліныя высь» і г. д.

Анамалістыка і арніталагістыка заўсёды цікавіла чалавецтва ў цэлым, імі не маглі не цікавіцца аўтары старадаўніх манускрыптаў, стваральнікі шматлікіх фальклорных твораў. Бо вобразы жывёл і птушак вандравалі па многіх помніках мастацтва, пачынаючы з паданняў, старадаўніх міфаў, народнага эпасу, біблейскіх сюжэтаў. Напрыклад архетып «голуб» прыйшоў да нас з «Бібліі», таксама як і архетыпы «рыба», «ягня», «вол», «колас», «сейбіт» і інш.

Таленавітыя паэты і ёсць перакладчыкі мовы птушак і звяроў на мову вершаваную, гэта людзі, якія ўмеюць тонка і глыбока пранікнуць, ужыцца ў норавы, паводзіны, псіхалогію жывых істот. Сярод анамалістычных вобразаў Купалы найчасцей сустракаюцца воўк і конь, хаця прысутнічаюць таксама вол і асёл. Але драпежны воўк, яго выццё бы запаўняе частку вершаў Я. Купалы першай паловы творчасці. Ваўку і ваўкалаку паэт прысвяціў асобныя вершы. Гэтыя істоты палохаюць сэрца жывога чалавека:

Зубам ляскоча аб зуб
Вочы палаюць агнём;
Стаў, як калода, як слуп,
Стаў і азваўся выццём.
Выў сярод дрэмлючых ніў,
Як бы на суд каго зваў,
Хто сатварыў, спарадзіў,
Хто узрасціў, гадаваў [5, с. 106].

Воўк блукае, «шнуруе туды і сюды», не ведае жалю. У Купалы гэта істота ўвасабляе сілы зла, страху, цемры, сквапнасці, жорсткасці, нават помстлівасці. Звер то «выццём закалыша прастор», то «шчэрыць зубы ў злоснай грымасе», а то «заскугоча ў сцішнай жальбе».

Падобная да купалаўскай трактоўка драпежнага вобраза ваўка ў нашай паэзіі мела працяг. Аднак тады, калі гэтага звера пачалі паўсюдна знішчаць як шкодніка, раптам адносіны паэзіі да яго памяняліся. І гэта выявіла і засведчыла характэрную экалагічную рысу беларускай паэтычнай свядомасці: творцы слова заўсёды шкадавалі жывое, не прымалі гвалту, жорсткасці. Стала заўважным, як пачалі паэтызавацца вартасці ваўчынага роду: сямейнасць, незалежнасць, адвага, мацярынская самаахвярнасць. Наогул, наша паэзія асуджае бяздушнае паляванне, браканьерства, забойства падобных сабе.

Свет жывёл у беларускай паэзіі разнастайны, але нельга не заўважыць, што на пярэдні план тут выходзіць вобраз каня.

Конь у далёкай старажытнасці абагаўляўся, у яго гонар спраўляліся розныя рытуалы. У славян-земляробаў гэтая жывёліна зрабілася незаменным памочнікам у працы, яе апекавалі і берaглі. Адносіны да каня ў беларускай паэзіі адухоўлена-ўшанавальныя, спагадныя, гуманістычныя. Бо коні і аралі, і цягалі бярвенне, прайшлі разам з чалавекам праз усе войны. Іх заслугам і вартасці Янка Купала не прысвяціў асобнага верша, але вобраз каня скразны ў творчасці нашага класіка.

У беларускай паэзіі мы сустракаем вобраз каня як сімвал руху, волі, палёту. Нярэдка вобраз каня для паэтаў – гэта магчымасць выказаць нешта душэўнае, асабістае ці ідэйна значнае (вершы Л. Галубовіча «Яшчэ раз пра коней», А. Пісьмянкова «Белы конь» і інш.).

**Заключэнне.** Такім чынам, у разуменні эстэтычных пошукаў Я. Купалы ключавой становіцца тэма нацыянальнага адраджэння. Да галоўных нацыянальных каштоўнасцей паэт адносіць Радзіму, род, мову, фауну і флору бацькаўшчыны.

У той жа час тэма птушак і звяроў дае нам уяўленне пра жывую прыроду, навакольны свет і свет унутры нас саміх. Паэтычнае стаўленне да жывых істот раскрывае духоўны воблік усёй нацыянальнай літаратуры, выяўляе стан маралі і чалавечнасці на зямлі.

## Літаратура

1. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1996. – 2003. – Т. 4: Вершы, пераклады 1915–1929. – С. 103.

2. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ. – Т. 5: Вершы, пераклады 1930–1942. – 1998. – С. 65.

3. Багдановіч, М. Поўны збор твораў: у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992–1995. – Т. 1: Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – С. 82.

4. Грачанікаў, А. Калі далёка ты… Выбраная лірыка / А. Грачанікаў. – Мінск: Маст. літ., 1979. – С. 308.

5. Купала, Я. Поўны збор твораў: у 9 т. / Я. Купала. – Мінск: Маст. літ., 1996. – 2003. – Т. 2: Вершы, пераклады 1908–1910. – С. 106.